*Я.І.Міронча*

# Беларускія архетыпы ў мастацкім адлюстраванні Якуба Коласа

На думку Якуба Коласа, эстэтычны пачатак сапраўднага мастака закладваецца самой прыродай: “Я спяваю тое, што ляжыць у мяне на сэрцы. Сэрца дано мне прыродаю, значыць сама прырода дала мне гэтае права. Я не магу пайсці проціў свае прыроды” [1, с.239].

Але чалавек як суб’ектыўная істота здольны на ілюзорнае ўспрыманне рэчаіснасці, што абумоўлівае ў выніку псіхічную паталогію. З гэтай прычыны ўзнікае праблема адэкватнага адлюстравання рэчаіснасці ў мастацтве.

У 1913г. на старонках “Нашай нівы” (№ 26-27) пачалася дыскусія аб шляхах развіцця новай беларускай літаратуры. Ю.Верашчака ў артыкуле “Сплачвайце доўг” патрабаваў ад беларускіх пісьменнікаў славіць хараство прыроды роднага краю, бо маркотныя вобразы, якія сталі напачатку XXст. традыцыйнымі, правакавалі ў грамадстве ўпадніцкія настроі. П.Навойчык сцвярджае, што ў гэтым сэнсе наша літаратура пачыналася як літаратура дэкадэнцкая, літаратура ўпадку і разбурэння, літаратура расчаравання і адчаю [2]. Такі стэрэатып грамадскага мыслення з’явіўся адной з прычын адмаўлення “маладнякоўцамі” старой літаратуры з яе сістэмай, насычанай народна-міфалагічнымі ўяўленнямі, фальклорнай спадчынай, якая часта становіцца сінонімам “старызна”. Адбываўся разрыў культурных традыцый, што непазбежна вяло да духоўнай дэградацыі беларускага грамадства.

Слушна заўважае В.Каваленка: без адчування таго святла духоўнасці, якое ідзе да нас з глыбіні вякоў, без ведання самога характару ўплыву мінулага на сённяшні дзень погляд на сучаснае не можа быць аб’ектыўным. Менавіта з гэтай акалічнасці даследчык выводзіць міфічна-казачны стылявы кірунак развіцця новай беларускай літаратуры, прычым народны эпас лічыць найбольш адэкватнай формай адлюстравання рэчаіснасці [3].

Але, як мяркуе Я.Колас, не ствараючы новага, нельга рухацца ўперад. І далей пісьменнік сцвярджае: паказ чалавека ў змененых варунках жыцця пабуджае да выкарыстання новых спосабаў і сродкаў выяўлення пачуццяў, думак з мэтай перадачы духоўнага багацця іншым. Такі працэс мастацкай творчасці Колас назваў сардэчнай размовай. Сама ж якасць сардэчнай размовы была, у сваю чаргу, прывіта пісьменніку журботнымі песнямі беларускага народа. Коласаў паэтычны маніфест “Не пытайце, не прасіце” выражае адзінства мастака з народам, адмаўляе філасофію “чыстага мастацтва”. І ўсім, хто не прымаў невясёлую песню пра народнае гора, цяжкасці народнага жыцця, Колас адказваў у алегарычнай навеле “На чужым грунце”. Ён нават крытыкаваў “саматканых імажыністаў” за “бурапенныя” іх песні [4].

У адрозненне ад імажыністаў Я.Колас заўсёды імкнуўся да непасрэднага псіха-эмацыянальнага кантакту са светам, з рэчаіснасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Эстэтычныя погляды пісьменніка аб чалавеку як люстэрку сусвету лагічна інтэгруюцца з філасофскім вучэннем аб чалавеку як мікракосме, які чуйна ўлоўлівае вібрацыі мікракосму. Вучонымі засведчана, што біццём сэрца чалавека ствараецца электрамагнітная хваля даўжынёй, роўнай сярэдняму значэнню велічынь усіх планет.

А.Швейцэр лічыў, што сапраўдная этыка ахоплівае ўвесь свет. Усё этычнае ўзыходзіць да адзінага этычнага прынцыпу – захавання і падтрымання жыцця [5]. Менавіта такое эстэтычнае асэнсаванне рэчаіснасці, уласцівае паганскай міфалогіі, ляжыць у аснове этычнага вучэння Коласа. У "Другім чытанні для дзяцей беларусаў" праз алегорыю пісьменнік выказвае глыбокую думку пра фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі, чалавечай годнасці ў дзетак беларусаў: "Ляпей зламацца зусім, чым гнуцца ўсялякай сіле" [6].

У народным эпасе сімвалы і алегорыі, семантыка якіх расшыфроўваецца праз паганскую міфалогію, надавалі кожнаму твору мастацкую непаўторнасць.

Нарэшце, шмат твораў Я.Коласа нясуць адбітак галоўнага культавага элемента народнага анімізму (ад гр. anima, animus – душа). Думка аб залежнасці чалавека ад прыроды як сродку існавання была закладзена ў свядомасці беларусаў яшчэ з дахрысціанскіх часоў. Лепшым сведчаннем гэтага служыць міф пра Кашчунаву смерць, схаваную ў "Залатым яйку". Кашчун папярэдзіў Дажбога, каб той не разбіваў яйка, бо "настане Канец Свету Белага! Узнімуцца Воды вялікія!" [7]. Адразу ж напрошваецца аналогія: яйка – атам – ядзерная рэакцыя.

Я.Колас праз свае творы вырашаў менавіта праблему гарманізацыі чалавека з прыродай. У трылогіі "На ростанях" сутнасць жыццёвай мудрасці старых палешукоў увасоблена аўтарам у сімвалічным вобразе дрэва пазнання, якое з'яўляецца спрошчаным варыянтам дахрысціянскай міфалагемы Сусветнага Дрэва (Дрэва Багоў, г.зн. Ведаў). Аналогію міфалагемы Дрэва Багоў сустракаем і ў хрысціянскай астральнай міфалогіі ў выглядзе Лесвіцы Якаба (Якуба), якая асацыіруецца з Млечным шляхам, што вядзе чалавека ў царства боскае, г.эн. з'яўляецца дарогай у нябёсы [8].

Самі назвы першай і другой аповесцяў трылогіі Я.Коласа "У палескай глушы" і "У глыбі Палесся" сімвалізуюць міфічную Нетру зямную, дзе бярэ свій пачатак усё жывое, дзе жывіцца карэннмі Дрэва Ведаў.

У асобе бабкі Мар'і, цельшынскай старожкі, мы пазнаём вобраз народнай вядунні, пра знахарства якой казалі ўсюды: у Хатовічах, у Малкавічах, у Ганцавічах. Бабка Мар'я ўвесь час нібы правакуе маладога настаўніка на роздум аб сэнсе жыцця. Навеяны вядзьмаркаю Мар'яй страх смерці аповедам пра Міхалкаву сустрэчу з нячыстаю сілаю моцна ўзрушвае дапытлівы розум Лабановіча і адчыняе тым самым шлях набыцця маладым настаўнікам жыццёвай мудрасці.

Само слова "вядуння" паходзіць ад санскрыцкага "веды". Паводле паганскай міфалогіі Рада-багіня, якая пашкадавала першага чалавека, слова боскае цудоўнае шапнула на вуха Еве, жонцы першачалавека [9]. І гэта слова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

было вядуннае. Сапраўды, нават цяпер вядункі-варажбіткі лечаць хворых, здольныя нават на цуды. Напрыклад, бабка Мар'я на свята вадохрышча здолела наваражыць цэбар свянцонай вады.

Нарэшце, таемная варажба вядунні Мар'і адхіляе ад Лабановіча змрочны прывід (дух) смерці ў той момант, калі да скроні ягонай быў прыстаўлены рэвальвер. У выніку нябожчык Андрэй быццам адышоўся ад яго, а разам з ім адышліся і думкі аб смерці. Такім чынам, Лабановіч атрымаў духоўную перавагу над слабасцю фізічнага існавання на грэшнай зямлі. Пастулова ён даходзіць да разумення мадэлі пазнання свету праз народны вобраз дрэва. Гэты шлях дазваляе маладому настаўніку дакладна вызначыць праблемы нацыянальнага адраджэння беларускага народа. Турсевічу ён кажа, што на галаву беларускага народа многа "выліта памыяў", што годнасць яго прыніжана і мова яго асмяяна, што ў яго няма імя, няма твару. Але народ жыве, бо ёсць яшчэ такія палешукі старой загартоўкі, як Грыгор і стары Мікіта, адораныя ад прыроды незвычайнай сілай. Як і дзед Грыгор, 80-гадовы Мікіта за пояс маладога заткне. І баяліся ў вёсцы Мікіты не з-за яго дужасці, а з-за таго, што ён – знахар, чараўнік. Прасунуўшы рукі ў камяні-жарнавікі, ён хадзіў з імі, як з лёгкімі кацёлкамі, упрысядкі танчыў. Гэта сведчыць аб тым, што менталітэт беларусаў пачаў складвацца яшчэ ў дахрысціянскія часы. Паводле паганскай міфалогіі Пярун, ахоўваючы Дрэва Багоў, выкрасаў маланку і гром менавіта з вялізных каменных жорнаў, надзетых на рукі.

Асілкам, нават волатам, паўстае перад чытачом стары Грыгор, які некалі адабраў у мядзведзіцы малое. У казачным эпасе зафіксаваны вобразы асілкаў-волатаў, якія перамагаюць уладара лесу мядзведзя.

Паводле міфалогіі волаты – галоўныя персанажы беларускіх паданняў і казак – з'яўляліся не толькі нашымі продкамі, але і пасрэднікамі паміж жывымі і богам Вялесам [10]. Менавіта ў замагільным "іншацарстве" Вялеса бярэ свой пачатак Сусветнае Дрэва, як тое зерне збажыны, кінутае ў чорную глебу. Гэтак і сімвалічнае дрэва Лабановіча сягае каранямі ў самую Нетру Палесся, дзе жывуць Вялесавы нашчадкі Мікіта, Грыгор, бабка Мар'я, на якіх трымаліся традыцыі сялянскай старажытнасці

Якуб Колас некалі выказваў ідэю стварэння зводу беларускага казачнага эпасу як універсальнай метадалагічнай асновы ўзбагачэння мастацкай літаратуры. Дзякуючы фальклору да нас дайшлі найбольш старажытныя эпічныя формы: загадкавыя легенды і паданні пра асілкаў-волатаў, чарадзейныя казкі, казкі пра жывёл і нейкіх містычных істотаў. У новай беларускай літаратуры XIX – пачатку XXст. такія элементы народнага эпасу, як апавядальнасць і натуралізм, увасобіліся ў апавяданнях і аповесцях, пісаных і вершам, і прозай. У прозе прыкладамі пераймання традыцый эпасу сталі апавяданні Францішка Багушэвіча "Дзядзіна", "Палясоўшчык". У паэзіі склалася рамантычна-этнаграфічная школа, прадстаўнікамі якой сталі Адам Міцкевіч, Уладзіслаў Сыракомля, Ян Чачот і іншыя паэты. Дзякуючы творчым намаганням Ядвігіна Ш., Каруся Каганца, Ластоўскага, Коласа і Максіма Гарэцкага народны эпас трывала замацаваўся ў адносна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кансерватыўных формах мастацкай літаратуры – у жанрах апавядання, навелы, абразка і верша ў прозе. У 1913г. Коласам была створана эпічная паэма “Новая зямля”, якая паводле рэалістычнасці адлюстравання жыцця народа ў XIX – пачатку XXст. можа быць класіфікавана як нацыянальная эпапея. У алегарычных навелах “казак жыцця” пісьменніктворча выкарыстаў традыцыі народнага эпасу праз жанр народнай казкі, прытчу, высока ацаніў іх дыдактычнае ўздзеянне. Літаратурна-мастацкае гучанне атрымала фальклорная сімволіка ў вершаваных апрацоўках [1, с.114]. Нарэшце цыкл палескіх аповесцяў мастака слова пад агульнай назвай “На ростанях” уяўляе сабою ў ідэйных і мастацкіх адносінах цэласны і завершаны твор (раман).

У наш час эпас стаў вядучым родам літаратуры. Вядомы сёння такія віды і жанры эпасу, як раман, аповесць, эпапея, апавяданне, нарыс, казка, легенда, фельетон, эсе і іншыя.

Найбагацейшы скарб беларускага народа фальклор мае выразны дыдактычны характар, прычым універсальны для ўсіх еўрапейскіх народаў.

Пашыраны ў фальклоры і літаратуры сюжэт пра ваўка ў авечай скуры (казкі “Каза на лазе”, “Каза і сямёра казлянят”, верш Ф.Багушэвіча “Воўк і авечка”). Паводле паганскай міфалогіі алегарычныя вобразы Казы і Ваўка мелі астранамічнае значэнне. Экліптыка Сонца і Месяца праходзіць праз Пляяды сузор’я Цяльца (“Сямёра казлянят”). На Каляды пад час зімовага сонцастаяння маладзіковы Месяц (галодны худы Воўк) затуляе зоркі Пляяды, дасягнуўшы фазы поўні (г.зн. раздзімаецца, з’еўшы Казлянят), а па хуткім часе (пасля ўмяшання паляўнічых) Пляяды зноў з’яўляюцца на сваім месцы, а Месяц збягае ад іх схуднелым (Ветах) [11]. Наогул культ Месяца (месяцовага рогу) быў вельмі пашыраны ў немцаў, французаў, магаметан.

Сама ж з’ява “нараджэнне Сонца” звязвалася таксама з Калядамі. Уладар цемры Чарнабог наўздагон цяжарнай багігі Жывы-Каляды паслаў ваўкоў-забойцаў. Жыва, петварыўшыся ў Казу, нарадзіла ў лазе светлалікага сонечнага Далібога (Дажбога) – сусвету уладара, гаспадара вялікага [12]. Так бярэ свій пачатак новы гадавы цыкл Сонца, якое нараджаецца на Каляды.

Такім чынам, зааморфныя міфалагічныя вобразы з’яўляюцца эмацыянальна-псіхалагічным кодам, які дазваляе нам спасцігнуць семантыку архетыпаў беларусаў, а значыць, і сваю генетычную сутнасць.

У святле паганскай міфалогіі зусім новае семантычнае гучанне атрымлівае фальклорная спадчына і спадчына Адама Міцкевіча, Уладзімслава Сыракомлі, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Менавіта праз раскадзіроўку архетыпа пачынаецца сапраўднае адраджэнне (адухаўленне) беларускага этнасу.

*ЛІТАРАТУРА*

1. *Колас Я*. Збор твораў: У 14 т. Т. 3. Мн., 1973.
2. *Навойчык П.* Дзве плыні ў “нашаніўскім” руху // Роднае слова. № 12. 1993. С.65.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. *Каваленка А.А.* Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. Мн., 1981. С.7.
4. *Жыдовіч І., Міцкевіч Д.* Вялікі пясняр беларускага народа. Мн. 1959. С.26-31.
5. *Швейцэр А.* Мировоззрение индийских мыслителей: Мистика и этика. – Восток-Запад. М., 1988. С.230.
6. *Колас Я.* Збор твораў. Т.4. М., 1973. С.219.
7. Русские веды. Песни птицы Гамаюн / Реконструкция и пер. Буса Кресеня (А.И.Асова). М., 1992. С.120-121.
8. *Святскій Д.* Лестница Јакова или сонъ наяву. Библейско-астрономическій этюдъ. СПБ., 1911. С.49.
9. *Хмара С.* Аб багох крывіцкіх сказы: (Першая беларуская міфалогія). Таронта, 1948. С.17.
10. *Дучыц Л.У.* Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў. Мн., 1993. С.13.
11. *Санько С. і інш.* Сусвет і мы // Родны край. Мн., 1995. С. 22, 12.
12. Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов. и Белорус. Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882г. Мн., 1993. С.252.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ